**Бяспалая М.А.**, *дацэнт*

# ПРАБЛЕМЫ КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ Ў 20-Я ГАДЫ І ІХ МЕСЦА Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Выкладанне гісторыі займае дастаткова важнае месца ў культуралагічнай адукацыі. Як сусветная гісторыя, так і гісторыя Беларусі даюць багаты матэрыял для тэарэтычных выкладак, агульных вывадаў, асэнсавання канкрэтных асаблівасцей і заканамернасцей развіцця гістарычнага працэсу ў цэлым і ў кожнай асобнай краіне. Любы гістарычны перыяд можа стаць зыходным матэрыялам і можа быць выкарыстаны ў гэтых мэтах. Аднак, здаецца, мы па нейкай інерцыі не заўважаем адзін з самых складаных і своеасаблівых перыядаў у развіцці нашай Бацькаўшчыны — 20-я гады бягучага стагоддзя. Усе падручнікі, і старыя і новыя, разглядаюць гэты перыяд (1921 — 1925 гг.) як аднаўленчы, які развіваўся пад уздзеяннем новай эканамічнай палітыкі досыць паспяхова. Аднак, як сведчаць навуковыя даследаванні, менавіта гэты перыяд дае багацейшы матэрыял для вывучэння эканамічнай тэорыі, сацыяльна-псіхалагічнага стану грамадства, станаўлення новага палітычнага жыцця і новай культуры.

Карыстаючыся многімі фактамі, трэба пачаць з перагляду храналагічных рамак перыяду. Да 1925г. працэс новых культурных пераўтварэнняў яшчэ не набыў завершанасці, пасля яго не пачалася новая паласа ў развіцці культуры. У якасці доказу прывядзем словы з выступлення сакратара ЦК КП(б)Б А.Крыніцкага перад студэнтамі і рабфакаўцамі ў лістападзе 1925г.: «Аб культурным будаўніцтве. Мы не маем яснага ўяўлення аб нашай рабоце. Блытаніна ў гэтым пытанні. Часта паўтараюцца словы т.Сталіна аб культуры, нацыянальнай па форме і прале-

тарскай на зместу. Але на справе гэтай формы мы яшчэ разумець не пачалі». 1925 год можна лічыць важнай, але прамежкавай вехай, а выніковым рубяжом можа быць 1927г. Менавіта ў гады першай пяцігодкі адбылося рэзкае змяненне культурнай палітыкі.

Перыяд 1921-1927 гг. надзвычай цікавы і важны не толькі ў плане выкладання гісторыі, але і культуралогіі. Ён дае рэдкую магчымасць вывучаць суіснаванне старога і новага: у эканоміцы -шматукладнасць і новая эканамічная палітыка; у палітыцы - некаторая адкрытасць палітычнага жыцця і кіруючая роля Камуністычнай партыі; у культуры — шматварыянтнасць і шматграннасць мастацтва і літаратуры і палітыка-асветніцкая дзейнасць дзяржаўных устаноў. Ніколі больш развіццё савецкага грамадства не было такім разнастайным, як у адзначаны перыяд.

Большасць дысцыплін, якія вызначаны вучэбнымі планамі, знаёмяць студэнтаў з культурным жыццём Беларусі ў 20-я гады. Стэрэатыпным з'яўляецца і набор накірункаў, па якіх ідзе вывучэнне гэтай тэмы: ліквідацыя пісьменнасці, беларусізацыя, тэатральнае мастацтва, навука, кіно і г.д. У падручніках прыводзіцца шмат лічбаў, якія павінны адлюстроўваць поспехі на культурнай ніве. Раней заслуга ў гэтым прыпісвалася Камуністычнай партыі і савецкай уладзе, цяпер гэтае пытанне неяк абыходзіцца. Аднак яно якраз і патрабуе нашай увагі. Трэба разабрацца, як гэта здарылася, што ўзнікла новая культура і даволі хутка змагла захапіць галоўныя пазіцыі. Нельга знайсці ва ўсёй сусветнай гісторыі лепшага прыкладу такога гвалтоўнага прышчэплівання на магутнае дрэва народнага жыцця новай ідэалогіі і культуры. Калі зыходзіць з пункту гледжання на рэвалюцыю як разбуральніцу ўсяго папярэдняга, то культурная рэвалюцыя бальшавікоў ёй адпавядала. Аднак на справе ўсё адбывалася не так проста.

Выкладчык павінен звяртаць увагу на вядомы прапагандысцкі штамп аб пераймaнні ў буржуазнай культуры ўсяго лепшага і аб



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спалучэнні яго з пралетарскай культурай. Заўважым, што ў гэтым добра вядомым словазлучэнні (буржуазная культура) няма нават намёку на існаванне народнай культуры. Ці то яе існаванне ігнаравалася зусім, ці то яна прызнавалася не дастойнай увагі на дзяржаўным узроўні, ці то ўлады былі ўпэўнены, што масы на «ура» ўспрымуць новую культуру? Чым жа другім можна растлумачыць той бясспрэчны факт, што самабытная народная культура, традыцыі, своеасаблівыя маральныя, этычныя правілы, усё тое, што складала непаўторнасць духоўнага жыцця народа, было як бы адсунута ўбок магутнаю рукою, запягнута шырмаю, і на чыстую сцэну выйшла культура перамогшага пралетарыяту.

У гэтым сэнсе асабліва цяжкая сітуацыя склалася на Беларусі. Кожны студэнт ведае, што асноўная частка насельніцтва рэспублікі пражывала на вёсцы, і гэтая акалічнасць надавала адметнасць культурнаму жыццю. Духоўныя традыцыі сялянства мелі шматвяковыя карані. Аднак яно разглядалася савецкай уладай як другараднае ў ідэалагічным плане. Таму, з прычыны сваіх ідэалагічных прынцыпаў, яна не стала абцяжарваць сябе стварэннем умоў для захавання гэтай спадчыны праз пераемнасць лепшых яе здабыткаў. Аднак даўно даказана, што любая (нават самая элітная) культура можа развівацца толькі на аснове роднай мовы, багатай народнай духоўнай спадчыны.

Культурная праграма большавікоў у галоўных рысах была распрацавана У.І.Леніным і другімі дзеячамі партыі. Вось, напрыклад, як раскрываў галоўныя мэты новай культуры А.В.Луначарскі ў адной з прамоў перад палітасветработнікамі: «У сацыялістычнай рэспубліцы не можа быць другой асветы, акрамя сацыялістычнай... Наша палітычная асвета павінна стаць усеагульнай, прасякнутай рэвалюцыйным духам самага баявога накірунку творчай волі...» Як бачым, задачы, якія ставіла савецкая ўлада ў галіне культуры, былі пазбаўлены галоўнай

умовы для развіцця культуры — пераемнасці і звязанага з ёй творчага пачатку. Сацыялістычная культура пачынала амаль з нуля, назапашаны народам вопыт не выкарыстоўваўся. Улічваючы гэтыя абставіны, мы можам і павінны гаварыць аб узнікненні новай культуры.

Каб хутка далучыць працоўных да гэтай культуры, прымаліся рашэнні аб адкрыцці ў населеных пунктах памятных дошак героям-рэвалюцыянерам усіх часоў і народаў — ад Рабесп'ера да Карла Лібкнехта і Розы Люксембург; аб святкаванні новых рэвалюцыйных свят — ад гадавіны Парыжскай камуны да Міжнароднага жаночага дня. Уся краіна была закідана брашурамі, лістоўкамі, іншымі агіткамі рэвалюцыйна-партыйнага зместу. Аднак гэтая дзейнасць, пазбаўленая павагі да культурнай спадчыны, не магла быць эфектыўнай. Наадварот, яна ўнесла глыбокі раскол у грамадства. Няцяжка заўважыць, што сялянства не мела ніякага ўяўлення аб асобах гэтых рэвалюцыянераў і аб новых святах.

Дзеля аб'ектыўнасці трэба адзначыць, што на самым высокім узроўні нацыянальная культура захоўвалася і знаходзілася нават у пашане. Гэта было выгадна з пункту гледжання партыйнай ідэалогіі. Як прыклад, успомнім вялікі поспех беларускай культурнай праграмы на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставе, якая пачала працаваць у жніўні 1923г. У Маскву прыехалі артысты 1-га Беларускага тэатра, хор пад кіраўніцтвам Тэраўскага, аркестр. Гасцям выставы і масквічам паказалі п'есы «Машэка», «На купалле», «Пінская шляхта». Вялікае захапленне гледачоў выклікала выступленне хору і цымбальнага аркестра. Было прынята рашэнне аб вывучэнні цымбал на прадмет іх музычнай класіфікацыі. Аднак заўважым, што ў Маскве выступалі прафесійныя артысты з народнымі творамі, апрацаванымі прафесійнымі музыкантамі.

Што ж тычыцца самабытнай народнай творчасці, то яна прызнавалася як бы другасортнай; некаторыя яе праявы атрымалі

проста знішчальныя характарыстыкі, асабліва ад камсамольскай моладзі. Да прыкладу, свята Купалле вызначалася як «нацыяналістычны шабаш контррэвалюцыі», а Каляды — як «свята буржуазна-кулацкай контррэвалюцыі». У вялікім мностве матэрыялу можна знайсці толькі два прыклады святкавання Купалля. Іх арганізавалі настаўнікі Крайскай школы, якія ў 1920-1923гг. стварылі культурна-асветніцкі гурток «Вянок».

Паўстае пытанне: як жа такое атрымалася? Чаму частка насельніцтва, асабліва моладзь, так рашуча ганьбавала духоўныя традыцыі сваіх бацькоў? Чаму так шчыра многія паверылі гучным лозунгам?

Гэтыя пытанні можна абмяркоўваць на занятках па гісторыі, культуралогіі, літаратуры, гісторыі мастацтваў. Варыянты адказаў будуць рознымі, аднак будзе прасочвацца некаторая заканамернасць. Як адзін з варыянтаў — недастатковая адукацыя насельніцтва, якая абумовіла адсутнасць палітычнай культуры. У сваю чаргу гэта садзейнічала веры ў савецкія міфы, імкненню ажыццявіць іх любымі сродкамі. У якасці дыскусійнага пытання можна абмеркаваць адзін з важнейшых накірункаў культурнай рэвалюцыі — ліквідацыю непісьменнасці. Яе лозунгі былі абвешчаны пасля 1917г., была створана камісія, але справа не пайшла, таму што вялікая беднасць, грамадзянская вайна не садзейнічалі яе поспеху. З 1924г. пачынаецца новая прапагандысцкая хваля вакол гэтай праблемы. Аднак заўважым, што ўся работа вялася на ўзроўні, так сказаць, «першага паверха», самых элементарных формаў ліквідацыі непісьменнасці. Умовы былі даволі прымітыўнымі: не хапала настаўнікаў, паперы, алоўкаў, метадычнай літаратуры, буквароў. Таму вынікі гэтай работы даволі сціплыя.

Частка моладзі вельмі актыўна падтрымала савецкую ўладу, шчыра паверыла ў яе лозунгі, у магчымасць жыць лепш пры іх ажыццяўленні. Яна прымала актыўны ўдзел ва ўсіх афіцыйных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мерапрыемствах, мітынгах, сходах, кампаніях. Камсамольцы і проста актывісты сталі асноўнай апорай партыйных органаў пры правядзенні работы ў масах. Малаадукаваныя і нават малапісьменныя людзі адыгрывалі галоўную ролю ў палітыка-асветніцкай рабоце. Менавіта яны ўзначальвалі народныя дамы, хаты-чытальні, чырвоныя куткі. Гэтыя культасветустановы павінны былі ў першую чаргу праводзіць у жыццё пастановы бюро ЦК КП(б)Б: «У бліжэйшыя месяцы народныя дамы, хаты-чытальні павінны праводзіць даклады, гутаркі па пытаннях каапераціі і калектывізацыі, аб ролі каапераціі ў барацьбе з прыватным капіталам, у тым ліку з кулаком. Поруч з дакладамі неабходна праводзіць вечары пытанняў і адказаў па гэтай праблеме, выкарыстоўваючы мастацкую літаратуру, інсцэніроўкі, індывідуальную і групавую агітацыю».

Гэтае пытанне таксама патрабуе больш дэталёвага аналізу. Як жа так атрымалася, што малаадукаваныя людзі неслі нейкую асвету ў такое ж асяроддзе? Які эфект мог быць ад такой асветы? Ды ці быў ён наогул? Ва ўсе часы і ва ўсіх народаў асветнікамі станавіліся самыя адукаваныя людзі, якія карысталіся павагай сучаснікаў і нашчадкаў. У нашай новай культуры ўсё сталася наадварот. Ва ўсякім выпадку, па гэтай праблеме можна арганізаваць дыскусію. Больш пільнага абмеркавання патрабуе пытанне аб формах і метадах асветніцкай работы. На сярэдзіну 20-х гадоў яны ў асноўным былі вызначаны. Пры народных дамах і хатах-чытальнях ствараліся разнастайныя гурткі: сельскагаспадарчыя, драматычныя, харавыя, ваенныя, палітграматы, праводзіліся лекцыі, мітынгі на палітычныя, антырэлігійныя тэмы, суботнікі, ставіліся спектаклі. Асноўныя масавыя мерапрыемствы адбываліся напярэдадні рэвалюцыйных свят, а асветніцкая работа гурткоў разгортвалася ў асноўным зімою. Мы павінны больш дакладна размяжоўваць палітыка-асветніцкую, культурна-асветніцкую работу і сельскагаспадарчае асветніцтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1921-1927 гг. аказаліся адметнымі ў станаўленні беларускай нацыянальнай культуры. Тварылі блізкія і вядомыя простаму люду Янка Купала, Якуб Колас, падымаўся шматлікі маладняк. Аднак паралельна развіваўся другі працэс: узнікалі народныя дамы, хаты-чытальні з куткамі У.І.Леніна, Чырвонай Арміі, МАПРа, антырэлігійнай прапагандай. Менавіта гэтая лінія ў культуры карысталася падтрымкай партыі і дзяржавы і ў рэшце рэшт перамагла. Такое аднначасовае існаванне двух плыняў у культуры 20-х гадоў якраз надае ім непаўторнасць, своеасаблівасць, робіць іх пераломнымі. З другога боку, менавіта гэтая акалічнасць і стала прычынай расколу ў грамадстве. Карыстаючыся сённяшняй тэрміналогіяй, трэба адзначыць, што савецкая ўлада заняла свабодную нішу. Малапісьменная вёска не магла актыўна знаёміцца з новымі літаратурнымі творамі, тым больш што ў тыя часы і газета была рэдкасцю на вёсцы, не гаворачы пра кнігу. І на вёску пачалося наступленне палітычнай прапаганды праз розныя афіцыйныя ўстановы. Фактычна аказаўшыся адзін на адзін з новай культурай, вёска, як магла, бараніла сваё духоўнае жыццё.

Як бачым, такі кароткі гістарычны перыяд, 1921-1927гг., ставіць перад намі, выкладчыкамі, шмат пытанняў. Яны могуць і павінны вырашацца падчас вывучэння розных дысцыплін культуралагічнага цыкла. Было б добра, каб на гэтых праблемах студэнты вучыліся рабіць вывады, шукаць доказы, вылучаць арыгінальныя думкі. Пакуль што гэты перыяд мы вывучаем дастаткова стэрэатыпна. Таму і вылучаюцца на абмеркаванне калег асноўныя, на погляд аўтара, праблемы, якія вынікаюць з аналізу шматлікіх фактаў: першая праблема — храналагічныя рамкі перыяду; другая — новая культурная палітыка, яе асноўныя мэты, накірункі, задачы; трэцяя — новая культура і духоўнае жыццё народа; чацвёртая — носьбіты новай культуры; пятая — ці маем мы права ўжываць тэрмін «новая культурная палітыка».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ